УДК 63: 001 «1920-1930» (476.6)

# АГРАРНАЯ АДУКАЦЫЯ І НАВУКА НА ГАРАДЗЕНШЧЫНЕ Ў 1920-1930 ГАДЫ

**В.У. Галубовіч**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Статья посвящена истории аграрного образования и науки на Гродненщине в 1920-1930 гг.

The article is dedicated to the history of the agricultural education and science in Grodno region in 1920-1930

У складзе другой Рэчы Паспалітай (1921-1939 гг.) Гародня страціла свой адміністрацыйны статус, а тэрыторыя Гарадзенскай губерніі ўвайшла ў склад некалькіх ваяводстваў. Гародня стала толькі павятовым цэнтрам у складзе Беластоцкага ваяводства.

Ужо ў першыя гады існавання польскай дзяржавы яе правячая эліта спрабавала вырашыць праблему пашырэння агратэхнічных ведаў сярод насельніцтва. Так, ужо ў ліпені 1920 г. быў прыняты закон "Аб народных сельскагаспадарчых школах", які прадугледжваў падрыхтоўку сялянскай моладзі да прафесійнай працы на зямлі ў спецыяльных школах. Такія школы падзяляліся як па крыніцам фінансавання, г. зн., маглі быць дзяржаўныя і прыватныя, так і па полу – жаночыя і мужчынскія. Тэрмін навучання складаў 11 месяцаў. Аднак у запланаваных памерах дадзены закон рэалізаваць не атрымалася [2, с. 67-72].

Сістэма прафесійнай адукацыі ў міжваеннай Польшчы адрознівалася ад расійскай у лепшы бок, аднак была далёкай ад дасканаласці. У 1920-1930-я гады Гарадзеншчына ўваходзіла ў склад Віленскай вучэбнай акругі. Па дадзеным на 1936 г. у гэтай вучэбнай акрузе было 60 прафесійных школ, а ва ўсёй Польшчы агульна налічвалася 714. Згодна з статыстыкай, прыведзенай у "Інфарматары прафесійных школ", у 1936 г. на акругу прыходзілася 15 школ з спецыялізацыяй у галіне сельскай гаспадаркі (у той час, калі прамысловых і рамесных школ налічвалася 23, гандлёвых – 15, тэхнічных – 5, хатнягаспадарчых – 2), а разам па краіне – 130. Улічваючы тое, што ў Віленскай акрузе сельскай гаспадаркай займалася 80% насельніцтва (у Наваградскім ваяводстве – 90%), колькасць школ выразна не адпавядала прафесійнай структуры края [8, s. 24-27]. Абмежаванасць магчымасцяў атрымання сярэдняй сельскагаспадарчай адукацыі была рэальнасцю і ўсведамлялася польскімі ўладамі [11, s. 20].

У складзе Віленскай вучэбнай акругі Гарадзеншчыне належала асаблівае месца. Менавіта тут, у Жыровічах, размяшчалася Дзяржаўная сярэдняя сельскагаспадарча-лясная школа, якая мела статус гімназіі. Мэтай навучання ў школе была падрыхтоўка сельскагаспадарчых і лясных тэхнікаў. Тэрмін навучання склаў тры гады, пасля чаго навучэнцы праходзілі год практыкі і здавалі галоўны іспыт. У Віленскай акрузе была яшчэ адна сярэдняя Дзяржаўная сельскагаспадарчая школа, яка знаходзілася ў Вільні. Там рыхтавалі тэхнікаў-агароднікаў [8, s. 46].

Існавалі і іншыя магчымасці атрымаць падрыхтоўку ў сельскагаспадарчай сферы. У сярэдзіне 1930-х гадоў дзейнічалі спецыяльныя Дзяржаўныя перасоўныя жаночыя курсы ў Ашмянскім павеце пры маёнтку Антавіль і ў Ваўкавыскім павеце пры маёнтку Азярніцы. Самакіроўныя перасоўныя сельскагаспадарчыя курсы для мужчын дзейнічалі ў той жа час у Ваўкавыскім павеце. У Гародні былі арганізаваны Агародніцка-перапрацоўніцкія курсы пры Дзяржаўнай кравецкай гімназіі, якая размяшчалася па адрасе: вул. Маставая, 9. Навучанне тут працягвалася адзін год: пачыналася 15 студзеня і заканчвалася 15 снежня [8, s. 63]. Выпускнікі гэтых курсаў пазней заснавалі Садова-пчалярскі каапературыў [14, s. 116].

На Гарадзеншчыне, за выключэннем уласна Гарадзенскага і Ваўкавыскага паветаў, дзейнічалі таксама ніжэйшыя гадавыя сельскагаспадарчыя школы, мэтай якіх была "падрыхтоўка сельскай моладзі да самастойнай працы ў невялікіх сельскіх гаспадарках". Да іх ліку адносілась мужчынская Дзяржаўная школа сельскагаспадарчай падрыхтоўкі ў Грыбаве (адчынена ў 1928 г.), якая размяшчалась у Слонімскім павеце (ёй падлягалі Гарадзенскі, Слонімскі, Ваўкавыскі, Нясвіскі і Баранавіцкі паветы); Публічная школа сельскагаспадарчай падрыхтоўкі ў Бердаўцах ў Лідскім павеце (адчынена ў 1927 г.), Публічная школа сельскагаспадарчай падрыхтоўкі ў Антонаве ў Ашмянскім павеце (адчынена ў 1930 г.); Публічная школа сельскагаспадарчай падрыхтоўкі ў Кушалеве ў Наваградскім павеце (адчынена ў 1926 г.), а таксама жаночая Дзяржаўная школа сельскагаспадарчай падрыхтоўкі сельскіх гаспадынь у Ражанцы ў Шчучынскім павеце (адчынена ў 1928 г.) [8, s. 34-36; 14, s. 4].

Вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю можна было атрымаць пры наяўнасці сродкаў і здольнасцей у шэрагу ўніверсітэцкіх гарадоў Польшчы. У дакладзе міністра сельскай гаспадаркі, які быў выкладзены ў сенаце 18 лютага 1931 г., адзначалася, што ў Польшчы было пяць сельскагаспадарчых факультэтаў, дзве ўстановы для падрыхтоўкі ветэрынараў, а таксама Навуковы інстытут у Пулавах.

Асабліва унікальным, нават для Еўропы, па меркаванні міністра, быў чатырохгадовы курс навучання на аддзяленні садаводства Галоўнай сельскагаспадарчай школы ў Варшаве [11, s. 20].

Для жыхароў Гародні і края найбольш блізкім універсітэтам, дзе дзейнічала сельскагаспадарчае аддзяленне, з'яўляўся адноўлены ў 1919 г. Віленскі ўніверсітэт, які атрымаў імя Стэфана Баторыя. Пастанова аб адкрыцці ва ўніверсітэце спецыяльнага аддзялення (Studium Rolnicze) была прынята ў 1923 г., і на працягу 15 наступных гадоў яно ўваходзіла ў структуру прыродазнаўча-матэматычнага факультэта [7, s. 167]. Галоўным чынам, з-за фінансавых праблемаў сельскагаспадарчае аддзяленне ажно да 1936 г. перманентна знаходзілася пад пагрозай ліквідацыі. Некаторы час на аддзяленні існавалі толькі першыя два курсы, а далейшае навучанне студэнты павінны былі праходзіць у іншых універсітэтах. Асобны сельскагаспадарчы факультэт быў створаны толькі 14 красавіка 1938 г. Першым дэканам яго стаў прафесар В. Ластоўскі, вядомы спецыяліст у вопытнай справе [7, s. 168-172]. Прайсці курс вышэйшай школы па аграрных спецыяльнасцях прапаноўвалі і больш надзейныя установы. Напрыклад, сельскагаспадарчае аддзяленне Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве альбо аддзяленне сельскай гаспадаркі і лесаводства Познаньскага ўніверсітэта. Прычым, менавіта на згаданым аддзяленні Ягелонскага ўніверсітэта, адчыненым яшчэ ў 1890 г., сапраўды фіксуецца прысутнасць ураджэнцаў Гарадзеншчыны як да Першай сусветнай вайны, так і пасля яе, у 1920-я гады [9, s. 158].

Нельга таксама не згадаць пра дзейнасць, бадай, адной з самых заўважных нацыянальных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920-1930 гг. – Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Гэтая грамадская структура займалася пашырэннем ведаў, у тым ліку ў галіне сельскай гаспадаркі. Напрыклад БІГіК арганізоўваў лекцыі па ветэрынарыі [1, с. 198-201].

На тэрыторыі Заходняй Беларусі праводзілася і навуковая праца ў галіне сельскай гаспадаркі. Такая дзейнасць ажыццяўлялася на ўтворанай яшчэ ў 1910 г. ля мястэчка Беняконі вопытнай станцыі. Гэта была заўважная падзея, на якую звярнуў увагу беняконскі карэспандэнт газеты "Наша Ніва": "*У нас адкрылася пробнае поле (станцыя) віленскага таварыства сельскай гаспадаркі на 15 дзесяцінах. Пабудавалі гожае муравана гумно, хату для чэлядзі, кожнаму па пакою і пекарні. Пакуль што жыве там і дырэктар станцыі аграном Ластоўскі, а на вясну будуць будаваць мураваны дом. Памешчыкі далі на станцыю 20 тысяч рублёў і казна 20 тысяч рублёў дасць, калі зацвердзіць Дума, і што год казна будзе даваць па 3*

*тысячы рублёў. У гэтым годзе пасадзілі на пробу 26 гатункаў бульбы, поле ўсё дрэнавалі. У восень жыта сеялі і садзілі розных гатункаў..."* [3, с. 12]. Акрамя доследнага поля тут былі арганізаваныя хімічная лабараторыя і метэаралагічная станцыя [10, s. 7, 9-11].

У 1920-1930-я гады гэта станцыя (па польскім адміністрацыйным падзеле яна размяшчалася ў Лідскім павеце Наваградскага ваяводства) паспяхова функцыянавала, пра што сведчаць апублікаваныя справаздачы, складзеныя яе неадменным дырэктарам Вацлавам Ластоўскім, які ў 1929 г. атрымаў ад польскага прэзідэнта званне прафесара сельскагаспадарчага аддзялення Віленскага універсітэта. З'яўляючыся заўважнай навукова-даследчай установай, Беняконская станцыя адначасова стала важным адукацыйным цэнтрам у краі. Пры станцыі мелася бібліятэка, якая налічвала каля тысячы тамоў [10, s. 29].

Навуковая дзейнасць станцыі мела практычны характар і ў асноўным засяроджвалася на селекцыі сартоў, прыдатных для вырошчвання ў мясцовых кліматычных умовах. Бадай, найбольшую вядомасць зазнала станцыя, дзякуючы селекцыі так званага Беняконскага жыта, якое найболей было распаўсюджана ў сялянскіх гаспадарках Віленшчыны. Акрамя гэтага на станцыі з 1912 г. праводзілася селекцыя аўса (выведзены гатунак "Longinus", а таксама "Канадзец", на аснове канадскага аўса), з 1921 г. – люпіну (выведзены гатунак "Беняконскі мурын"). У выніку селекцыйнай працы былі атрыманы такія гатункі бульбы, як "Беняконская гаўронка" і "Імператарская карона" беняконскай селекцыі [10, s. 25-29].

У 1928 г. праца станцыі была адзначана на выставе ў Познані залатым медалём [10, s. 29].

Вопытныя палі станцыі выкарыстоўваліся для практычных заняткаў і падрыхтоўкі дыпломных праектаў студэнтаў Віленскага ўніверсітэта. Актыўную асветную дзейнасць разгарнуў дырэктар станцыі В. Ластоўскі. Напрыклад, у 1929 г. ён арганізаваў двухдзённыя курсы для 42 інструктараў. Сам кіраўнік установы чытаў рэфераты на пасяджэннях сельскагаспадарчых арганізацый. Пра значнасць Беняконскай станцыі сведчыць наведванне яе вышэйшымі дзяржаўнымі ўраднікамі: у 1929 г. станцыю аглядаў міністр сельскай гаспадаркі Л. Янта-Палчынскі, Наваградскі ваявода Бечковіч з Лідскім старостам Багатоўскім [15, s. 2].

Ветэрынарная служба ў Гародні, відавочна, была наладжана адразу пасля заканчэння вайны, паколькі ўжо ў 1922 г. на гарадской бойні ажыццяўлялася ветэрынарнае інспектаванне і вялася адпаведная статыстыка. У 1922 г. дзейнічала Санітарна-мікраскапічная станцыя [12, s. 72-81]. Паводле надрукаванага ў "Статыстычным аглядзе горада

Гародні за 1922 і 1923 гады" паведамлення гарадзенскага гарадскога ветэрынарнага ўрача Вінцэнта Леановіча, у паваенным горадзе адбылося паляпшэнне ветэрынарнага нагляду, дзякуючы абгараджэнню месца гандля жывеламі і выкарыстанню жорсткіх ветэрынарна-паліцэйскіх募раў. Леановіч В. сцвярждаў, што да вайны на кірмашах у Гародні не існавала кантролю за продажам быдла. Праведзены Санітарнай станцыяй на бойні аналіз здароўя жывел сведчыў пра катастрафічны рост ў паваенныя гады колькасці паталогій і павелічэнні колькасці выпадкаў захворвання матыліцай, што В. Леановіч тлумачыў павелічэннем забоя жывёлы простай пароды і змяншэнне выпадкаў захворвання на сухоты, на якія звычайна хварэлі пародзістыя жывёлы. У 1922 г. і 1923 г. заразлівыя хваробы выступалі спарадычна, за выключэннем сверба ў коней і вар'яцтва [12, s. 82-83].

Да сярэдзіны 1920 г. працы ветэрынарам дадалося, паколькі ў Гародні быў адноўлены даваенны ўзровень забоя жывёлы [13, s. 73].

Аграрны характар краю прадвызначыў асаблівую ўвагу гарадзенскіх павятовых уладаў да праблемаў сельскай гаспадаркі. На практыцы гэта ўвасаблялася ў павелічэнні грашовах асігнаванняў на гэтыя мэты: толькі з 1927 г. па 1929 г. такія выдаткі ўзраслі ў тры разы. У 1928 г. павет утрымліваў 5 аграномаў і 4 ветэрынарных урача, а ў 1929 г. мелася 6 амбулаторый для лячэння жывёлы. Павет быў падзелены на раёны па даследаванню мяса забойнай жывёлы [6, с. 453-454].

Для павышэння аграрнай адукаванасці ў Гарадзенскім павеце наладжвалі спецыяльныя курсы, чыталі лекцыі. Ужо на 1924 г. у павеце было закладзена 50 вопытных палёў, а павятовы соймік у 1924 г. стварыў на базе дзяржаўнага маёнтка паказальную гаспадарку, дзе адбывалася размнажэнне племяннной англійскай жывёлы, а ў 1929 г. там жа быў закладзены пітомнік садовых дрэваў і табачная плантацыя. Паказальных палёў на 1929 г. у павеце налічвалася амаль дзве сотні. Некаторыя карысныя для развіцця сельскай гаспадаркі ініцыятывы гарадзенскіх павятовых уладаў, як заснаванне пітомніка ў маёнтку Котра, не былі рэалізаваны з-за сусветнага эканамічнага крызіса. Мелі месца і сельскагаспадарчыя выставы: у 1930 г. у Гародні адбыліся чатыры выставы коней і жэрабятаў і адна авечак. Для цікаўных была адчынена і сельскагаспадарчая бібліятэка [6, с. 453-454]. Да 1936 г. адзінай сельскагаспадарчай арганізацыяй у павеце быў Павятовы сельскагаспадарчы хаўрус, а пазней аднавіла сваю дзейнасць Акруговае таварыства сельскагаспадарчых арганізацый і суполак [14, s. 116].

У 1920-1930-я гады на Гарадзеншчыне распаўсюджвалася прэса па розных пытаннях сельскагаспадарчай дзейнасці як навуковага, так і навукова-папулярнага характару. Да прыкладу быў вядомы навукова-папулярны спецыялізаваны часопіс “Беларуская борць” (1934-1938 гг.), галоўным рэдактарам якога была Л.А. Войцік (З. Верас). У прысвечаным, галоўным чынам, пчалярству выданні таксама публікаваліся артыкулы па садаводству, агародніцтву, жывёлагадоўлі, ветэрынарыі [4, с. 368]. З асобных беларускамоўных выданняў па сельскагаспадарчай тэматыцы напэўна найбольш заўважнымі з’яўляюцца кнігі Я. Пачопкі “Малочная карова” (1923 г.), “Пчолы і як вадзіць іх у рамовых вуллях” (1923 г.), “Гародніцтва” (1925 г.) [5, с. 309-310].

У 1921-1939 гг. адукацыя і навука на Гарадзеншчыне вызначаліся палітыкай польскага урада. Сярэдняя сельскагаспадарчая адукацыя стала ў гэты час бліжэй геаграфічна, але доступ да яе быў абмежаваны. Для набыцця вышэйшай кваліфікацыі гарадзенцы былі вымушаныя выязджаць у буйныя ўніверсітэцкія цэнтры Польшчы. Найбольш заўважнай навуковай-даследчай установай краю стала Беняконская вопытная станцыя.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Вашкевіч, А.Ф. Гарадскія і мястэчковыя арганізацыі Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі і Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры (1921-1939 гг.) // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зб. навук. арт. Гродна: ГрДУ, 2007. С. 198-201.

2. Крывуць, В.І. Сельскагаспадарчая падрыхтоўка моладзі Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг. // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. № 3. 2009. С. 67-72.

3. Наша Ніва. 1911 г. № 50. 15 снежня 1911 г.

4. Саламевіч, І.У. Беларуская борць // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1. Мн.: БелЭн, 1993. С. 368.

5. Туронак, Ю. Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы 1921-1939 // Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. С. 278-322.

6. Черепица, В.Н. Звенья цепи единой: Большие и малые события в истории Гродненщины XIX-XX столетий: моногр. - Гродно: ГрГУ, 2009.

7. Bortkiewicz-Szyszkowska, A. Z historii wydziału rolniczego Uniwersitetu Stefana Batorego // Z dziejów Almae Matris Vilnensis. Księga pamiątkowa ku czci 400-lecia założenia i 75-lecia wskrzeszenia Uniwersytetu Wileńskiego. Kraków: Wydawnictwo WAM, 1996. S. 166-184.

8. Informator szkół zawodowych okręgu szkolnego wileńskiego. Opracowany przez koło wileńskie stowarzyszenia nauczycieli szkół zawodowych. Wilno: Nakładem dziennika urzę dowego kuratorium okr. Wilenskiego, 1937.

9. Jun, J.F. Studium rolnicze (1890-1923). Wydział rolniczy Uniwersytetu Jagiellońskiego. Kraków: Nakładem wydziału rolniczego UJ, 1934.

10. Lastowski, W. Wileńska rolnicza st. Doświadczalna w Bieniakoniach: jej powstanie, rozwój i organizacja. Wilno: Zakłady Graficzne “ZNICZ”, 1935.

11. Organizacja rolnictwa. Przemówienie Ministra Rolnictwa D-ra L. Janta-Połczyńskiego wygoszone w Komisji Skarbowo-Biudżetowej Senatu dn. 18.II.1931 r. Warszawa: Drukarnia mazowiecka, 1931.

12. Przegląd statystyczny m. Grodna za lata 1922 i 1923 (Z uzwględnieniem w niektórych działach lat ubiegłych i pierwszego pórocza 1914 r.). Grodno: Drukarnia M. Gana, 1925.
13. Przegląd statystyczny m. Grodna w latach 1924, 1925 i 1926. Grodno: Nakładem magistrata m. Grodno, 1928.
14. Wychowankowie szkół rolniczych o swojej pracy, życiu i dążeniach w okręgu szkolnym Wileńskim. Zebrał i wstępem zaopatrzył Stanisław Łukaszewicz. Warszawa: Nakładem Państw. Instytutu Naukowego Gosp. Wiejskiego w Puławach, 1937.
15. Wyniki doświadczeń polowych. Wileńska Rolnicz Stacja Doświadczalna w Bieniakoniach. Za 1930 rok. Opracował Prof. Wacław Lastowski. Warszawa: R. Olesiński, W. Merkel i S-ka, 1931.